Георгій
КАРЗЕНКА

# Старонкі гісторыі навуковай інтэлігенцыі ў даваенны перыяд

Падрыхтоўка маладых навукоўцаў праводзілася як у ВНУ Беларусі, так і ў аналагічных установах саюзных рэспублік. У 1925 г. з Беларусі ў Інстытут чырвонай прафесуры было накіравана 25 чалавек[32]. У 1926 г. пры вышэйшых навучальных установах Беларусі вучыліся 17, а ў іншых рэспубліках — 32 аспіранты[33]. Меркавалася некаторых пасылаць для навуковай стажыроўкі за мяжу. Практычна ўсе яны вярталіся ў рэспубліку, каб заняцца выкладчыцкай дзейнасцю. Магчымасць вучыцца ў вялікіх навуковых цэнтрах, у вучоных іншых краін высока цанілася сярод маладых людзей, якія прысвяцілі сябе навуцы.

Пасяджэнне Народнага камісарыята асветы БССР з удзелам рэктараў ВНУ 13—15 снежня 1926 г. падвяло вынікі работы нацыянальнай аспірантуры34. У ліку чарговых задач стаяла задача распрацоўкі перспектыўнага плана падрыхтоўкі навуковых кадраў, узгодненага з патрабаваннямі народнай гаспадаркі.

Станоўча ацэньваючы дзейнасць Наркамасветы і грамадскіх арганізацый у фарміраванні складу аспірантуры, звярталася ўвага "на паляпшэнне адбору з ліку студэнтаў для падрыхтоўкі да будучай навуковай дзейнасці", гаварылася пра неабходнасць заснавання "інстытута студэнтаў-практыкантаў" пачынаючы з другога паўгоддзя перадапошняга курса. Гэтыя студэнты атрымлівалі стыпендыю, якая захоўвалася за імі пры напісанні дысертацыі на працягу года пасля заканчэння ВНУ, а на гуманітарных факультэтах — на працягу 6 месяцаў.

Абмяркоўваліся праблемы, звязаныя з функцыяніраваннем аспірантуры. Падрыхтоўку спецыялістаў можна было весці толькі на тых кафедрах, дзе была прафесура. Упершыню ставілася пытанне пра формы павышэння кваліфікацыі "ужо працаваўшых навуковых спецыялістаў (асістэнтаў, дацэнтаў, прафесараў)"35. На аснове рашэнняў гэтага пасяджэння Галоўнае ўпраўленне прафесіянальнай адукацыі ў першай палове 1927 г. распрацавала праекты палажэнняў "Аб інстытуце аспірантаў", "Аб студэнтах-практыкантах" (вылучэнцах) і накіравала іх для абмеркавання ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Так паступова прыходзіла асэнсаванне важнасці праблемы выхавання маладой навуковай змены. У гэты працэс уключаліся і навуковыя ўстановы. На пасяджэнні вучонага савета Інбелкульта 21 кастрычніка 1925 г. (пратакол 3) быў заслуханы даклад С.Некрашэвіча "Пра падрыхтоўку маладых навуковых работнікаў БССР", у якім дакладчык прапанаваў: "...весці падрыхтоўку навуковых работнікаў у Беларусі, што будзе ўвогуле садзейнічаць навуковай дзейнасці, а ў выпадку, калі немагчыма даць адпаведную кваліфікацыю, то можна будзе пасылаць у РСФСР і УССР"36. Тэрмін навучання ў аспірантуры вызначаўся ў 3 гады, пасля чаго маладыя спецыялісты павінны былі трымаць экзамен на навуковага супрацоўніка, адначасова абараняючы сваю самастойную навуковую працу. Толькі пасля такой падрыхтоўкі было пажадана для павышэння кваліфікацыі пасылаць за мяжу.

З 1927 г. кадравая праблема становіцца важнейшым накірункам дзяржаўнай палітыкі. 8 чэрвеня СНК рэспублікі зацвердзіў "Палажэнне аб навуковых работніках вышэйшых навучальных і навуковых устаноў", якое рэгламентавала парадак прызначэння і звальнення, прысваення вучонага звання, матэрыяльнага і пенсіённага забеспячэння работнікаў навуковай сферы[37]. У адпаведнасці з ім закладваліся прававыя асновы аспіранцкай формы навучання ў рэспубліцы. У дзяржаўным бюджэце рэспублікі быў уведзены раздзел аб фінансаванні -- "Падрыхтоўка да навуковай і навукова-педагагічнай дзейнасці". Адначасова ў структуры Наркамасветы ствараецца Галоўнае ўпраўленне навуковых устаноў замест Галоўнага ўпраўлення прафесіянальнай адукацыі (Галоўнавука), якое размяркоўвала асігнаванні, ажыццяўляла рэалізацыю навуковай і кадравай палітыкі.

У 1927/28 навучальным годзе ў ВНУ і навукова-даследчых установах Беларусі аспіранты вучыліся пры Інстытуце сельскай і лясной гаспадаркі, Беларускім дзяржаўным універсітэце, Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, Віцебскім ветэрынарным

**Заканчэнне. Пачатак у № 3 за 2000 г.**

інстытуце, Камуністычным універсітэце і Інстытуце беларускай культуры[38]. Іх колькасць не адпавядала патрэбам айчыннай навукі. Падрыхтоўка навуковых спецыялістаў не вялася па хіміі, заалогіі, батаніцы, хімічных тэхналогіях, эксперыментальнай біялогіі, фізіцы, тэхніцы і інш. Якасць падрыхтоўкі аспірантаў была нізкая, таму што большая частка іх адбіралася "не па сваіх прыродных здольнасцях і схільнасцях да навуковай дзейнасці, а выпадкова, у значнай ступені па пратэкцыі"[39].

Пры Інстытуце беларускай культуры існаваў штат аспірантаў з 14 чалавек, з якіх толькі 5 пасад займалі работнікі з высокай кваліфікацыяй. Акрамя таго, не ўсімі ўстановамі былі распрацаваны праграмы навучання. У параўнанні з іншымі саюзнымі рэспублікамі і, у прыватнасці, з РСФСР, дзе асноўная частка аспірантаў праходзіла падрыхтоўку пры навукова-даследчых інстытутах, у Беларусі большасць аспірантаў вучылася пры вышэйшых навучальных установах.

У 1927 г. на Украіне налічвалася 1 285 аспірантаў, у Расіі — 1 800, Азербайджане — 200, а ў Беларусі толькі 93 аспіранты[40]. Большасць аспірантаў рэспублікі праходзіла падрыхтоўку па сельскагаспадарчых спецыяльнасцях — гэтага патрабавала народная гаспадарка. Іх сярэдні ўзрост складаў крыху больш за 28 гадоў, 70% — карэнныя жыхары Беларусі.

У канцы 1929—пачатку 1930 гг. увага дзяржаўных органаў да праблемы кадраў рэзка ўзрасла. XII з'езд КП(б)Б (люты 1929 г.) вызначыў шляхі фарсіраванай падрыхтоўкі новых кадраў. 1 ліпеня 1929 г. сакратарыят ЦК КП(б)Б абмеркаваў пытанне "Аб аспірантуры ў БССР". Колькасны, сацыяльны і партыйны яе склад быў прызнаны нездавальняючым[41].

У выніку была прынята пастанова, якая вызначыла практыку кадравай работы і выхавання на перспектыву. Поўная адказнасць за колькасны і якасны склад, адбор і навуковую падрыхтоўку кадраў ускладвалася на Народны камісарыят асветы. Асаблівая ўвага кіраўніцтва ВНУ і НДІ звярталася на павелічэнне колькасці аспірантаў за кошт пралетарскіх слаёў насельніцтва, вызначалася, каб сярод іх членаў партыі было не менш за 50%. У мэтах паляпшэння планавання падрыхтоўкі спецыялістаў лічылася мэтазгодным, каб кожная вышэйшая навучальная ўстанова пакідала аспірантаў згодна са сваім планам і патрэбамі ў кваліфікаваных кадрах. У комплекс мерапрыемстваў па паляпшэнню дзейнасці аспірантуры ўваходзілі стварэнне пры Галоўнавуцы аспіранцкай камісіі, у склад якой уваходзілі старшыня Галоўнавукі, прадстаўнік аспіранцкага бюро пры секцыі навуковых работнікаў, а таксама прадстаўнікі аспіранцкіх камісій пры навучальных і навуковых установах; канкрэтызацыя планаў падрыхтоўкі аспірантаў па гадах; стварэнне пры ВНУ "інстытута студэнтаў-практыкантаў", з ліку якіх рыхтаваліся кандыдаты ў аспірантуру.

Аспірантура станавілася асноўнай формай падрыхтоўкі маладых вучоных, ёй забяспечвалася прыярытэтная падтрымка дзяржавы. За гады першай пяцігодкі з 27,6 млн. руб., якія былі затрачаны на навукова-даследчую працу ў Беларусі, непасрэдна на падрыхтоўку аспірантаў выдзелена 3,2 млн. руб.[42]. Расходы на навучанне аспірантаў у 1931 г. склалі 955,3 тыс. руб. супраць 193 тыс руб. у 1929—1930 гг. (г.зн. выраслі амаль у 5 разоў). Колькасць аспірантаў у вышэйшых навучальных і навукова-даследчых установах у 1929—1930 гг. павялічылася са 152 чалавек да 394. Стыпендыя -- са 120 да 200 руб. Упершыню для аспірантаў была ўведзена аплата камандзіровачных расходаў[43].

На працягу 1930-х гг. сістэма прафесіянальнай падрыхтоўкі кадраў атрымала заканадаўчае афармленне. З мэтай узмацнення планамернасці работы Саўнаркам рэспублікі сканцэнтраваў падрыхтоўку аспірантаў пры Акадэміі навук БССР па наступных дысцыплінах: сацыяльна-гістарычнай, літаратурна-моўнай, прыродазнаўчай, матэматычнай, тэарэтычнай эканоміцы і інш. Па гісторыі УКП(б) падрыхтоўка вялася пры Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б, па іншых дысцыплінах — пры адпаведных установах. Навуковае і метадычнае кіраванне гэтым працэсам ускладалася на Народны камісарыят асветы.

Істотныя змены ў механізм узнаўлення навуковых і выкладчыцкіх кадраў унеслі пастановы СНК БССР "Аб падрыхтоўцы аспірантаў" ад 25 верасня 1932 г. і 2 чэрвеня 1933 г. Кожны аспірант на працягу першага года навучання павінен быў не менш як 2 разы выступіць на навуковых канферэнцыях, адзін раз у паўгоддзе спецыяльныя камісіі правяралі іх веды і толькі па выніках праверкі яны пераводзіліся на наступны курс. Аспірантам забаранялася сумяшчальніцтва. Дырэктыўнымі органамі было прынята замацаванне аспірантаў за вызначанымі профільнымі кафедрамі, устаноўлены навуковыя заданні і ўводзіліся індывідуальныя планы, абавязковая здача залікаў, а пасля заканчэння навучання праходзіла абарона дысертацыі. Для ўпарадкавання падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў была павялічана колькасць устаноў, распрацаваны профілі спецыяльнасцей і праграмы навучання, уводзілася палажэнне аб навуковым кіраўніцтве аспірантамі. Было прызнана неабходным пасылаць у аспірантуру вышэйшых навучальных устаноў саюзных рэспублік не больш за 20% ад агульнага кантынгенту аспірантаў з апошніх курсаў, у першую чаргу па фізіцы, матэматыцы, тэхналогіі хіміі, геалогіі, эканоміцы, гісторыі, філасофіі, мове, праву. Вызначаўся дыферэнцыраваны памер стыпендыі — 175—300 руб. у месяц (1933 г.).

У верасні 1930 г. была адкрыта аспірантура ў Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б[44]. Там рыхтаваліся навуковыя супрацоўнікі і выкладчыкі гісторыі партыі для вышэйшых устаноў. У лік аспірантаў уключаліся выкладчыкі БДУ, якія спецыялізаваліся

па гэтай галіне. У 1930/31 навучальным годзе вызначылі прыняць 10—12 аспірантаў.

З 1 студзеня 1931 г. для больш планамернай падрыхтоўкі кадраў і паляпшэння навукова-метадычнага кіраўніцтва ствараецца Інстытут аспірантуры Беларускай акадэміі навук, куды былі накіраваны 83 аспіранты з Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 28 — з Медыцынскага інстытута, 8 — з Камуністычнага універсітэта, 7 — з Інстытута педагогікі і педалогіі. Усяго былі накіраваны 173 аспіранты[45]. Калектыўная форма вучобы, калі разам вучылася каля 300 чалавек па розных спецыяльнасцях, не апраўдала сябе на практыцы. У 1931—1934 гг. Інстытут аспірантуры скончылі 109 чалавек, з іх у 1931 г. — 14, у 1932 г. — 23, у 1933 г. — 42, у 1934 г. — 30 чалавек. Са 109 выпускнікоў 62 былі размеркаваны на работу ва ўстановы Беларускай акадэміі навук і 47 — у іншыя ўстановы[46].

З кастрычніка 1933 г. пачалі рыхтаваць кваліфікаваныя кадры ў аспірантуры Беларускага інстытута народнай гаспадаркі па статыстыцы, фінансавых дысцыплінах, народнагаспадарчаму планаванню (усяго 8 чалавек)[47]. У гэтым жа годзе пачала працаваць аспірантура пры Мінскім педагагічным інстытуце са спецыялізацыямі па беларускай і рускай мовах, літаратуры, усеагульнай літаратуры, педагогіцы і ўсеагульнай гісторыі. Пазней былі ўведзены спецыялізацыі па педагогіцы, фізічнай і эканамічнай геаграфіі. Да пачатку 40-х гг. у аспірантуры інстытута вучылася каля 50 чалавек[48].

Для кіраўніцтва падрыхтоўкай аспірантаў, чытання лекцый запрашаліся вядомыя вучоныя рэспублікі (прафесары У.Перцаў, З.Магілёўчык), Масквы (прафесары У.Бокараў, Р.Кабо, І.Іваноў, Я.Лоя, С.Абакумаў, А.ЛІпатаў і інш.), Ленінграда (прафесар Г.Яфімаў). Кансультацыі праводзілі прафесары з Масквы Б.Грэкаў, Ю.Гацье і інш.

Колькасць аспірантаў хутка расла. У 1929 г. у аспірантуры вучыліся 124, у 1930 — 260, на 1 студзеня 1934 г. — 485 чалавек[49]. Высокія тэмпы росту колькасці аспірантаў пры слабай матэрыяльнай базе навуковых цэнтраў прывялі да таго, што практычна ў працэсе навучання толькі адзінкі змаглі атрымаць адпаведную навуковую ступень. Пагоня за колькаснымі паказчыкамі прывяла да аслаблення патрабаванняў да навуковай падрыхтоўкі маладых вучоных.

Уяўленне пра сістэму работы аспірантуры 30-х гг. дае "Праграма падрыхтоўкі аспіранта І.Юркевіча на кафедры агульнага лесаводства Беларускага лесатэхнічнага інстытута з 20.02.1930 г. па 20.02.1931 г.". У яе ўваходзіла 6 раздзелаў і спіс неабходнай літаратуры. Размеркаванне заняткаў было наступнае: грамадска-палітычныя дысцыпліны — 20%, спецыяльная падрыхтоўка — 65%, педагогіка — 5%, замежныя мовы — 10%. Вытворчая практыка займала 25—33% ад усёй падрыхтоўкі[50]. І.Юркевіч скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Ён прайшоў шлях асістэнта, дацэнта, прафесара (1949 г.). Быў абраны акадэмікам АН БССР (1956 г.), атрымаў званне заслужанага дзеяча навукі рэспублікі (1968 г.). Ён з'яўляецца стваральнікам і арганізатарам рэгіянальнай геабатанічнай школы.

Аднак не ўсе аспіранты маглі выканаць патрабаванні, якія прад'яўляліся да падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў. Беларуская акадэмія навук была не ў стане забяспечыць правядзенне семінараў па палітычнай эканоміі, тэорыі імперыялізму, беларускай мове, гісторыі Захаду, па вучэнні аб дзяржаве. Не хапала таксама спецыялістаў па правядзенні семінарскіх заняткаў у ВНУ і НДІ. Гэта адмоўна адбівалася на сістэме падрыхтоўкі навуковых кадраў, вяло да значнага адсеву з аспірантуры. Напрыклад, у 1933 г. у Беларускай акадэміі навук пакінулі аспірантуру 50 чалавек[51]. Класавы падыход да падбору аспірантаў нярэдка ствараў праблемы для таленавітай моладзі, асабліва "непралетарскага паходжання", пры залічэнні ў аспірантуру.

Прэзідэнт Акадэміі навук БССР з 1952 г. па 1969 г. акадэмік В.Купрэвіч, у аўтабіяграфіі якога ў час паступлення ў Інстытут аспірантуры "пільныя кіраўнікі" знайшлі слова "камандор", у заяве ад 7 ліпеня 1931 г. пісаў: "Па незразумелай для мяне прычыне слова "камандор" у маёй аўтабіяграфіі ў інстытуце растлумачваюць як "марскі афіцэр" — катэгарычна пратэстую супраць такога тлумачэння і разам з тым з усёй адказнасцю заяўляю, што ніякім "афіцэрам" не быў і не мог быць, што могуць пацвердзіць гэта мае саслужыўцы па флоце — яны жывыя людзі"[52]. У гэтым выпадку ўсё абышлося. Васіль Феафілавіч быў залічаны ў аспірантуру, абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі ў галіне біялогіі, стаў выдатным арганізатарам навукі ў рэспубліцы, дзяржаўным дзеячам, Героем Сацыялістычнай Працы, членам-карэспандэнтам АН СССР. Ён пачынальнік новага накірунку ў вывучэнні глебы — глебавай энзімалогіі. Але з-за такой "пільнасці" навука губляла шмат высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Большасць аспірантаў даваеннага перыяду, сутыкаючыся з аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі негатыўнымі фактарамі, была слаба падрыхтавана для творчай дзейнасці і не абараняла кандыдацкіх дысертацый. Прафесіянальнай падрыхтоўцы аспірантаў не надавалася належнай увагі, шматлікія рашэнні не выконваліся. "Бадай што ні ў адной галіне нашага будаўніцтва мы не назіраем такога беспарадку і такой стыхійнасці, як гэта мы бачым у справе падрыхтоўкі навуковых работнікаў. Да цяперашняга часу Дзяржплан БССР не мае ні гадавога, ні пяцігадовага перспектыўнага плана падрыхтоўкі навуковых кадраў. Не маюць яго і іншыя органы. Планаванне тут адсутнічае поўнасцю. Між тым праблема навуковых кадраў, як ва ўсім Савецкім Саюзе, так асабліва і ў БССР, з'яўляецца самай вострай і ў той жа час самай складанай праблемай, над якой трэба перш за ўсё сур'ёзна працаваць", — пісаў віцэ-



Заслужаны дзеяч навукі БССР, першы доктар медыцынскіх навук Я.Корчыц.



М.Бяадуха.



Б.Тарашкевіч.



П. Туткоўскі.



БЕЛАРУСКАЯ
АКАДЭМІЯ НАВУК

Менск, 1 студзеня 1929 г.
№ 1041-2

Урадовай Камісіяй, зложанай з прадстаўнікоў грамадзкіх, навукова-дасьледчых, вышэйшых навучальных і вышэйшых урадовых установ Беларускай Савецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, вызначанай Саветам Народных Камісараў БССР 13 сьнежня 1928 году для абраньня першага складу правадзейных членаў Беларускай Акадэміі Навук, Вы, ... абраны і зацьверджаны 26 сьнежня 1928 году Саветам Народных Камісараў БССР правадзейным членам (акадэмікам) Беларускай Акадэміі Навук.

Прэзыдыум Беларускай Акадэміі Навук, паведамляючы аб наданьні Вам гэтай высокай годнасьці, упэўнены, што, падзяляючы ўзложаную на Беларускую Акадэмію Навук адказнасьць, Вы ўзбагаціце беларускую навуку сваёй дасьледчай працай.

Прэзыдэнт

Неадменны Сакратар

Паведамленне А.Карпінскаму, што ён абраны правадзейным членам (акадэмікам) Беларускай Акадэміі навук.

прэзідэнт АН БССР В.Шчарбакоў[53]. У падрыхтоўцы мелася шмат схаластыкі, нярэдка толькі кніжнай вучобы. Адсутнічалі профілі спецыяльнасцей, па якіх неабходна было весці падрыхтоўку. Размеркаванне аспірантаў вялося без уліку патрэб устаноў у навуковых работніках. Вялікая колькасць розных адміністрацыйных даручэнняў адбівалася на якасці іх вучобы. Нярэдка ў ВНУ 25—30% аспірантаў займаліся арганізацыйнай работай, а лекцыі яны наведвалі як "сумяшчальнікі". Для тэарэтычнай падрыхтоўкі ім не хапала часу. Не хапала таксама і сродкаў для вучобы аспірантаў -- з-за гэтага скарачаліся камандзіроўкі, закупка неабходнага абсталявання. Цяжкімі былі і бытавыя ўмовы.

З другой паловы 30-х гг. пачалося зніжэнне колькасці аспірантаў. Калі ў 1934 г. у акадэмічнай аспірантуры вучылася 139 чалавек, то ў 1938 г. — толькі 6 чалавек[54]. У аспірантуры Белдзяржуніверсітэта ў 1930 г. вучылася 87 аспірантаў, а ў 1935 г. — толькі 19[55]. Прыкладна такая ж сітуацыя складвалася і ў іншых навуковых установах. На 1 кастрычніка 1938 г. у Беларусі налічвалася 109 аспірантаў. У параўнанні з 1933 г. (432 чалавекі) іх колькасць паменшылася ў 4 разы[56]. Арышты вучоных і аспірантаў вялі таксама да значнага скарачэння навуковых кадраў.

Аднак, нягледзячы на ўсе гэтыя недахопы і рэпрэсіі, падрыхтоўка спецыялістаў праз аспірантуру адыграла важную ролю ў стварэнні высокакваліфікаваных кадраў вучоных. Толькі ў 1933—1934 гг. у Акадэміі навук БССР абаранілі кандыдацкія дысертацыі больш за 24 чалавекі. Сярод іх І.Сяржанін (біялогія), І.Лушчыцкі (права), А.Юрашкевіч (права), Р.Рубіна (літаратура), А.Воранава (гісторыя), Я.Равун (эканоміка), С.Карабан (філасофія), П.Пратасеня (філасофія) А.Пад'ярэзны (эканоміка), М.Матусевіч (эканоміка), І.Каплінскі (эканоміка) і інш. У 1940 г. 6 вучоных акадэміі атрымалі адпаведную навуковую ступень, а ўсяго працавала 67 кандыдатаў навук[57].

У Беларускім лесатэхнічным інстытуце ў 1935—1941 гг. кандыдацкія дысертацыі абаранілі па тэхнічных навуках М.Рудзіцын, Х.Стэфаноўскі, С.Мураўёў, А.Ціханаў, У.Янушка, па сельскагаспадарчых — У.Палякоў, А.Пятруша, П.Рагавы, па біялагічных — Г.Гуляга. У 1940 г. над дысертацыямі працавалі 20 выкладчыкаў, а абаранілі іх 3 чалавекі[58].

У 1941 г. у Беларускім політэхнічным інстытуце было 32 кафедры, на якіх працавала 180 выкладчыкаў, у тым ліку 19 прафесараў і 71 дацэнт[59].

У даваенны перыяд у Беларусі пачалася падрыхтоўка кадраў і вышэйшай кваліфікацыі. Яшчэ ў маі 1926 г. секцыя навуковых супрацоўнікаў Інстытута беларускай культуры, зыходзячы з еўрапейскай класіфікацыі, распрацавала палажэнне аб ступені доктара навук. Указвалася, што яна ўводзіцца для ўпарадкавання кваліфікацыі навуковых супрацоўнікаў вышэйшых разрадаў і будзе надавацца асобам, якія маюць вялікія заслугі ў навукова-даследчай галіне, пасля публічнай абароны даследавання. 9 лістапада 1926 г. прэзідыум медыцынскага факультэта БДУ абмеркаваў пытанне аб наданні вучонай ступені медыцынскім работнікам. У прынятай пастанове гаварылася, што для іх неабходна ўвесці толькі вучоную ступень доктара медыцыны і праводзіць абарону на факультэце па ўсіх медыцынскіх дысцыплінах.

Згодна Палажэнню аб навуковых супрацоўніках (1927 г.), вышэйшыя навучальныя і навукова-даследчыя ўстановы рэспублікі мелі права надаваць ступень доктара па навуковых дысцыплінах, якія зацверджаны Народным камісарыятам асветы, вызначаўся парадак публічнай абароны навуковых прац[60].

Прадугледжвалася выдача дыплома аб наданні ступені доктара пэўнай галіны навукі, які падпісваўся народным камісарам асветы і рэктарам (або дырэктарам) навуковай установы. У дадатак да Палажэння супрацоўнікамі БДУ былі распрацаваны інструкцыі аб дыскусіях пры абароне дысертацыі і пералік дысцыплін, па якіх магла надавацца ступень доктара навук. "На медыцынскім факультэце яна надавалася па ўсіх прадметах; на педфаку — па расійскай і беларускай гісторыі (доктар гісторыі), расійскай і беларускай літаратуры (доктар літаратуры), славянскай філалогіі і гісторыі мовы (доктар славянскай філалогіі); хіміі (доктар хіміі), батаніцы, заалогіі, біялогіі (доктар прыродазнаўчых навук); на праўгасе (аддзяленні прававога гаспадарання. -- **Г.К.**) — па ўсіх грамадскіх дысцыплінах, уключаючы эканоміку і права надаваць ступень доктара права, эканомікі і сацыялогіі"[61].

У лістападзе 1927 г. на медыцынскім факультэце адбылася абарона першай у Беларусі доктарскай дысертацыі дацэнтам кафедры факультэцкай хірургіі Яўгенам Вітольдавічам Корчыцам па тэме "Механізм і класіфікацыя пераломаў асновы чэрапа ў брохіцэфалаў і доліхацэфалаў". Праца вялася ў Інстытуце аператыўнай хірургіі і тапаграфічнай анатоміі Ваенна-медыцынскай акадэміі пад кіраўніцтвам прафесара В.Шаўкуненкі. Афіцыйнымі апанентамі выступілі прафесары С.Рубашаў і М.Сакалоўскі, якія далі высокую ацэнку дысертацыі[62]. Гэтая падзея мела значны грамадскі рэзананс. У газеце "Рабочий" ад 22 лістапада 1927 г. быў змешчаны артыкул пад назвай "Первый доктор медицины Е.В.Корчиц". Доктар медыцынскіх навук Я.Корчыц (1880—1950) працаваў у Мінскім медыцынскім інстытуце да апошняга дня: загадваў кафедрамі аператыўнай хірургіі і тапаграфічнай анатоміі, агульнай, факультэцкай і шпітальнай хірургіі. Ён быў адзін з арганізатараў анкалагічнай службы ў рэспубліцы. У 1929 г. Яўген Вітольдавіч атрымаў званне прафесара, у 1947 г. яго абралі членам-карэспандэнтам АН БССР.

Пра механізм абароны і зацвярджэнне доктарскіх дысертацый сведчаць наступныя дакументы:

1. "Аб абароне дысертацыі. Старшыні Галоўнавукі т.Некрашэвічу ад 16 лютага 1928 г. У нядзелю, 19 лютага 1928 г., у 1 гадзіну дня ў памяшканні нервовай клінікі БДУ (Свярдлоўская вул.) адбудзецца публічная абарона дысертацыі доктара Ю.М.Ірґера на ступень доктара медыцыны, на абароне якой Праўленне універсітэта просіць ВАС прысутнічаць. Рэктар БДУ праф. У.І.Пічэта". На ім рэзалюцыя С.Некрашэвіча. "18.II.1928. Даручаецца Сінякову"[63].

2. "У калегію Наркамасветы. Разгледзеўшы матэрыялы аб дысертацыйнай працы Ю.М.Ірґера (назва апушчана. — **Г.К.**) на атрыманне ступені доктара медыцыны, Галоўнавука канстатуе, што вышэйадзначаная праца Ю.М.Ірґера з'яўляецца каштоўным укладам у навуку, таму згадзілася з пастановай пасяджэння прафесараў і дацэнтаў медыцынскага факультэта і пастановай Праўлення БДУ аб наданні Ю.М.Ірґеру ступені доктара медыцыны. Старшыня Галоўнавукі С.Некрашэвіч"[64]. На аснове такога дакумента Наркамасветы рэспублікі зацвярджаў абарону і выдаваў дыплом адпаведнага ўзору.

У студзені 1934 г. была прынята пастанова Саўнаркама СССР "Аб вучоных ступенях і званнях", паводле якой устанаўліваліся дзве ступені — кандыдата і доктара навук, якія "вызначалі кваліфікацыю дадзенай асобы ў галіне адпаведнай навуковай дысцыпліны па аб'ёму ведаў, ступені самастойнасці яго навуковай працы і яе навуковаму значэнню"[65].

Пастановай СНК рэспублікі ад 27 лістапада 1934 г. "Аб парадку падрыхтоўкі аспірантаў і кантынгентах прыёму на 1934/35 навучальны год"[66] на Беларускую акадэмію навук ускладалася задача падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў навуковых супрацоўнікаў, якія б дасканала валодалі сваёй спецыяльнасцю для далейшай навукова-даследчай дзейнасці ва ўстановах акадэміі і ў іншых навуковых установах. У аспірантуру (у далейшым дактарантуру) прымаліся асобы, якія актыўна ўдзельнічалі ў сацыялістычным будаўніцтве, паспяхова абаранілі дысертацыю на ступень кандыдата навук, а таксама асобы, якія не мелі навуковай ступені кандыдата навук, але мелі працы па спецыяльнасці і змаглі б абараніць дысертацыю на ступень кандыдата навук на працягу першага года вучобы ў аспірантуры. Пасля заканчэння вучобы аспіранты былі абавязаны прадставіць дысертацыю на ступень доктара навук. Тэрмін вучобы вызначаўся ў 3 гады. Кандыдаты ў яе вылучаліся НДІ, адпаведнымі кафедрамі вышэйшых навуковых устаноў з абавязковым апублікаваннем у друку вылучаных кандыдатур і рэкамендуючых арганізацый. У 1934 г. у дактарантуру было прынята 11 чалавек.

Пры прэзідыуме БелАН ствараліся кваліфікацыйныя камісіі, якія спачатку займаліся і атэстацыяй кадраў. На працягу 1935 г. камісія атэставала 108 чалавек, з іх 79 — супрацоўнікі акадэмічных устаноў. Ступень доктара навук надалі толькі 9 чалавекам (адзін з іх – акадэмік з 1940 г. У.Перцаў).

Канчатковае афармленне дадзеная форма падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі атрымала ў Статуце АН БССР 1936 г., у якім указвалася, што пры акадэміі створана "спецыяльная аспірантура, у якую прымаліся асобы, якія зарэкамендавалі сябе паспяховай навуковай працай і мелі ступень кандыдата навук".

Пастановамі СНК СССР ад 20 сакавіка 1937 г. і 26 красавіка 1938 г. рэгламентаваліся парадак публічнай абароны кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, асноўныя патрабаванні, якія прад'яўляліся да іх якасці, і ўмовы, якія дазвалялі надаваць вучоныя званні асобам, якія мелі навуковыя працы і заслугі[67].

Разам з тым ступень доктара навук магла надавацца і без абароны дысертацыі вучоным, якія зрабілі навуковыя адкрыцці, а таксама вучоным, якія мелі выдатныя творы або працы. Яе аўтаматычна атрымлівалі асобы, якія да часу надання ступені былі абраны акадэмікамі саюзных і рэспубліканскіх акадэмій навук. Права надаваць вучоную ступень і званне прадастаўлялася прэзідыумам АН СССР і саюзных рэспублік. Згодна гэтай пастанове, ступень доктара навук без абароны дысертацыі была нададзена Я.Афанасьеву, Т.Домбалю, І.Замоціну, С.Вальфсону, М.Грэдзінгеру, П.Горыну (Калядзе), А.Кедраву-Зіхману, С.Матулайцісу, М.Нікольскаму, П.Панкевічу, В.Сербенту, В.Шчарбакову і інш., якія ўнеслі вялікі ўклад у развіццё беларускай навукі.

У вышэйшых навучальных установах таксама шукалі шлях для павышэння кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага скпаду і падрыхтоўкі дактароў навук. Адной з форм такога пошуку з'явілася вылучэнне кандыдатаў навук на доктарскія стыпенды тэрмінам на 2 гады.

На пасяджэнні савета Беларускага лесатэхнічнага інстытута 8 мая 1941 г. на яе атрыманне быў вылучаны дацэнт У.Палякоў з адначасовым зацвярджэннем тэмы доктарскага даследавання "Прыроднагістарычныя ўмовы, якія вызначаюць вытворчасць прыродных чорна-альховых лясоў БССР і шляхі рэканструкцыі альховых насаджэнняў"[68].

Аднак трэба адзначыць, што ў даваенны перыяд шырокага распаўсюджвання дактарантура не атрымала.

Вялікую дапамогу ў фарміраванні кадравага патэнцыялу Беларусі аказвалі ВНУ і НДІ СССР, дзе вялася падрыхтоўка па новых напрамках навукі прыродазнаўча-навуковага і тэхнічнага профіляў. Гэта інстытуты фізікі і матэматыкі АН СССР (Масква), Тэхнічны інстытут (Масква), Інстытут матэматыкі і тэхнікі МДУ, Усесаюзны энергетычны інстытут (Масква), НДІ геаграфіі (Масква), Інстытут эканамічных даследаванняў пры Дзяржплане СССР, Інстытут народнай гаспадаркі імя Г.В.Пляханава (Масква), Маскоўскі, Ленінградскі, Днепрапятроўскі універсітэты, Фізіка-матэматычны інстытут Украінскай Акадэміі навук (Кіеў), Планава-эканамічны інстытут (Ленінград), Інстытут мікрабіялогіі і Інстытут біялогіі

сельскагаспадарчай акадэміі (Ленінград), Ленінградскі горны інстытут і інш. Паводле паведамлення кіраўніцтва БелАН у Камісію пры СНК БССР, у 1933 г. было камандзіравана ў навуковыя цэнтры СССР 56 чалавек. З іх спецыялізавалася па фізіцы і матэматыцы 19 чалавек, біялогіі — 7, эканоміцы — 11, хіміі — 4, глебазнаўству — 3, літаратуры — 1, філасофіі — 1, гісторыі — 3, мовазнаўству — 1 чалавек і інш.[69]. У 1934 г. у аспірантуру было накіравана яшчэ 25 чалавек.

Многія аспіранты сталі выдатнымі вучонымі і ўнеслі значны ўклад у развіццё айчыннай навукі. Гэта акадэмік В.Купрэвіч, заснавальнікі фізічнай навукі ў рэспубліцы акадэмікі А.Сеўчанка і Ф.Фёдараў, арганізатар хімічных даследаванняў акадэмік М.Паўлючэнка, члены-карэспандэнты П.Бялькевіч і Т.Бірыч.

Так, напрыклад, Ф.Фёдараў пасля заканчэння фізіка-матэматычнага аддзялення педагагічнага факультэта БДУ працаваў выкладчыкам педагагічнага тэхнікума ў Крычаве. У 1933 г. паступіў у аспірантуру Ленінградскага універсітэта, дзе вучыўся ў выдатнага фізіка-тэарэтыка У.Фока. Ён адразу акунуўся ў навуковую атмасферу, у якой вялікую прыцягальную сілу мела тэорыя адносінасці. За кароткі тэрмін (1933—1936 гг.) Ф.Фёдараў хутка засвоіў новыя ідэі і з дапамогай метаду функцыяналаў Фока разгледзеў прынцыповыя пытанні тэорыі электрамагнітных узаемадзеянняў элементарных часцінак. Стаўшы кандыдатам навук (1936 г.), у 1938 г. арганізаваў у БДУ кафедру тэарэтычнай фізікі. Ф.Фёдараў — першы беларус, якому надалі ступень доктара фізіка-матэматычных навук, першы беларус лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і БССР. У 1979 г. ён атрымаў званне Герой Сацыялістычнай Працы.

У вывучэнне старажытнага перыяду гісторыі Беларусі значны ўклад унеслі А.Ляўданскі, К.Палікарповіч, Дз.Даўгяла, С.Дубінскі. Яны праводзілі раскопкі старажытных паселішчаў. Выдатныя вучоныя-геолагі П.Туткоўскі, М.Бліадухо, Б.Тарлецкі вывучалі праблему гідраэнергарэсурсаў, асаблівасці геалагічнай будовы рэспублікі. З іх удзелам былі адкрыты новыя месцазнаходжанні каштоўных выкапняў, складзены кадастр грунтовых і падземных вод басейнаў рэк Заходняй Дзвіны і Прыпяці.

Пашырэнню і ўзаемаабагачэнню супрацоўніцтва ў кадравай сферы садзейнічалі выбары правадзейных членаў Акадэміі навук. За заслугі ў арганізацыі і рабоце навуковага цэнтра Беларусі побач з такімі вядомымі вучонымі і дзеячамі культуры рэспублікі, як Я.Афанасьеў, М.Бліадухо, Г.Гарэцкі, З.Жылуновіч (Цішка Гартны), У.Ігнатоўскі, І.Луцэвіч (Янка Купала), К.Міцкевіч (Якуб Колас), С.Некрашэвіч, І.Пятровіч, У.Пічэта, Б.Тарашкевіч, правадзейнымі членамі Беларускай акадэміі навук сталі прэзідэнт Акадэміі навук СССР А.Карпінскі, неадменны сакратар АН СССР С.Ольдэнбург, акадэмікі М.Марр, М.Пакроўскі, В.Вільямс, прэзідэнт Усеўкраінскай акадэміі навук Д.Забалотны, акадэмікі АН УССР М.Скрыпнік і П.Туткоўскі.

Важную ролю пры гэтым адыграла сістэма падрыхтоўкі навуковых кадраў, якая склалася ў гэты перыяд. Яе мэта — улік аб'ектыўных тэндэнцый развіцця навукі і стварэння спрыяльных умоў для фарміравання маладых вучоных. Гэта дало магчымасць камплектаваць навуковыя ўстановы кваліфікаванымі кадрамі і рашаць жыццёва неабходныя сацыяльна-эканамічныя і культурныя праблемы рэспублікі.

---

[32] Гісторыя Беларускай ССР. Т. 3. Мн., 1973, сс. 311—312.
[33] НА РБ, ф. 42, воп. 1, спр. 319, а. 76.
[34] Там жа, ф. 205, воп. 1, спр. 216, аа. 54—55.
[35] Там жа, а. 263.
[36] ЦНА НАНБ, ф. 67, воп. 1, спр. 12, аа. 20—24.
[37] СЗ БССР, 1927, № 29, с. 141.
[38] НА РБ, ф. 205, воп. 1, спр, 1069, а. 135.
[39] Там жа, ф. 42, воп. 1, спр. 1932, а. 4.
[40] Иванова Л.В. Формирование советской научной интеллигенции (1917—1927). М., 1980, с. 265.
[41] НА РБ, ф. 205, воп. 1, спр. 369, а. 61.
[42] Ітогі першай пяцігодкі БССР. Мн., 1934, с. 73.
[43] Сводный финансовый план и государственный бюджет БССР на 1931 г. Мн., 1930, с. 99.
[44] Михнюк В.Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919—1941 гг.). Мн., 1985, с. 28.
[45] ЦНА НАНБ, ф. 1б, спр. 6, а. 2.
[46] Токарев Н.В. Академия наук Белорусской ССР: годы становления и испытаний (1929—1945 гг.). М., 1988, с. 56.
[47] Белорусский государственный институт народного хозяйства им. В.В.Куйбышева, с. 18.
[48] Минский государственный институт им. А.М.Горького. Мн., 1970, с. 21.
[49] НА РБ, ф. 215, воп. 1, спр. 1, аа. 1—3 адв.
[50] Там жа, ф. 756, воп. 1, спр. 13, а. 18.
[51] СЗ БССР, 1934, № 45, с. 222.
[52] ЦНА НАНБ, ф. 1б, воп. 1, спр. 1, а. 111.
[53] Щербаков В.К. БССР и новые кадры // Фронт науки и техники, 1931, № 4—5, с. 40.
[54] Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. ІІ, с. 186.
[55] НА РБ, ф. 205, воп. 1, спр. 633, а. 8; спр. 454, аа. 1—4.
[56] Культурное строительство СССР: Стат. сб. М.—Л., 1940, с. 243; Итоги выполнения первого пятилетнего плана развития народного хозяйства БССР. Мн., 1933, сс. 106—107.
[57] Академия наук Белорусской ССР. Мн., 1989, с. 21.
[58] НА РБ, ф. 756, воп. 1, спр. 104, а. 22.
[59] Белорусский политехнический институт. Мн., 1974, с. 18.
[60] СЗ БССР, 1927, № 29, с. 141.
[61] Гэты дакумент датаваны 1 снежня 1927 г. і падпісаны У.І.Пічэтам // НА РБ, ф. 205, воп. 1, спр. 267, а. 37.
[62] Родина И.Ф., Шишко Е.И. К истории защиты первой докторской диссертации в Минском медицинском институте // Вопросы истории медицины и здравоохранения БССР: Тез. докл. V науч. конф. Ч. ІІ. Мн., 1984, сс. 10—11.
[63] НА РБ, ф. 42, воп. 1, спр. 1932, а. 84.
[64] Там жа, а. 83.
[65] СЗ СССР, 1934, № 3, с. 30.
[66] СЗ БССР, 1934, № 45, с. 222.
[67] СЗ СССР, 1937, № 21, с. 83; 1938, № 21, с. 134.
[68] НА РБ, ф. 756, воп. 1, спр. 107, аа. 1—2.
[69] ЦНА НАНБ, ф. 1б, воп. 1, спр. 25, а. 4.